*А.І.СМОЛІК*

## БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ НА МЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ

Працы, прысвечаныя вывучэнню культуры як асобай формы арганізацыі жыцця чалавека, з'явіліся ў шэрагу еўрапейскіх краін прыкладна ў 50-я гады XIX ст. У гэты перыяд пачынае фарміравацца самастойная навука, якая даследуе гістарычнае развіццё культуры і ажыццяўляе параўнальны аналіз розных яе тыпаў, вывучае заканамернасці функцыянавання і структурнай арганізацыі, узаемадзеяння з прыроднымі ўмовамі. У канцы XIX ст. ужо былі заснаваны кафедры ва універсітэтах і нават створаны цэлыя інстытуты, галоўнай задачай якіх было вывучэнне культур у гістарычным і структурна-функцыянальным аспектах. Для сістэматызацыі, абагульнення канкрэтна-эмпірычных даных выкарыстоўваліся розныя метады, прыёмы, ствараліся тэорыі культур, культуралагічныя канцэпцыі, якія ўпарадкоўвалі разрозненыя звесткі ў адзіную, цэласную карціну.

Да пачатку XX ст. сфарміраваліся розныя кірункі ў вывучэнні культур: эвалюцыянісцкі, дыфузіянісцкі, біялагічны, псіхалагічны, функцыянальны і інш. Моцны ўплыў на станаўленне гэтых кірункаў аказалі заходнееўрапейскія вучоныя Г.Спенсер, Э.Тайлар, А.Басціян, Л.Г.Морган, Ф.Рэтцэль, Л.Фрабеніус, Ж.А.Гібіно, М.Лацарус, Г.Лебан, Г.Тард, З.Фрэйд, Г.Рахейм, К.Юнг, Б.Маліноўскі, А.Р.Радкліф-Браўн, Э.Дзюркгейм і інш. Значны ўклад у развіццё тэорыі культурна-гістарычнага працэсу ўнеслі расійскія культуролагі гэтага часу М.Я.Данілеўскі, П.А.Сарокін, М.А.Бярдзяеў, А.А.Патабня і інш.

Культуралагічныя даследаванні на тэрыторыі сучаснай Беларусі пачаліся ў перыяд Адраджэння. Праблемы нацыянальнай і рэлігійнай самаідэнтыфікацыі, біблейскай і антычнай традыцый адлюстроўваліся ў творах Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага, М.Сарбеўскага, С.Полацкага, М.Сматрыцкага, А.Філіповіча.

Упершыню да навуковага асэнсавання праблем фарміравання айчыннай культуры беларускія даследчыкі звярнуліся ў канцы XIX — пачатку XX ст. Пытанні развіцця беларускай культуры закраналіся ў этнаграфічных і фальклорных працах П.А.Бяссонава, Л.Бараўскага, Я.Ф.Карскага, А.Г.Кіркора, Е.Р.Раманава, М.Я.Нікіфароўскага, І.А.Сербава, Ю.Ф.Крачкоўскага, П.В.Шэйна, М.І.Касяровіча, М.Федароўскага, Я.П.Пышлевіча і інш. Яны на аснове глыбокага комплекснага параўнальна-гістарычнага абагульнення фактычнага матэрыялу абгрунтавалі нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа, які стварыў сваю багатую і арыгінальную культуру.

Вызначальную ролю ў распрацоўцы тэорыі і гісторыі айчыннай культуры адыгралі працы беларускіх вучоных другой паловы XX ст. Г.І.Барышава, Я.М.Бабосава, Ю.А.Гусева, Р.В.Грабеннікава, У.М.Конана, М.І.Крукоўскага, Г.А.Каханоўскага, М.С.Кацара, З.Я.Мажэйкі, В.Ф.Нячай, А.В.Сабалеўскага, Я.М.Сахуты, Р.Б.Смольскага, Д.С.Трызны, В.У.Пазнякова, В.Ф.Шматава, Ю.М.Чурко і інш. У іх навуковых працах даследуюцца розныя аспекты фарміравання і функцыянавання прафесійнага і народнага мастацтва, даецца гістарычны агляд развіцця духоўнай культуры ў Беларусі.

У 90-я гады XX ст. цікавасць да вывучэння культуры істотна ўзрасла. Вучоныя сусветнай супольнасці спрабуюць адказаць на пытанне: "Што ўяўляе сабой гістарычны шлях чалавецтва — паслядоўнае развіццё па пэўнай схеме (стадыі, этапы) або ўзаемадзеянне розных тыпаў культур-цывілізацый?" З такім аспектам аналізу цесна звязаны праблемы ўдасканалення культур, распрацоўкі мадэляў будучага развіцця і ўплыву чалавека на ход гісторыка-культурнага працэсу ў цэлым. У гэты час у навукова-даследчых і вышэйшых навучальных установах Беларусі ствараюцца кафедры культуралогіі, у вучэбны працэс уводзіцца культуралагічны курс. Цікавасць да дысцыплін культуразнаўчага цыкла з'яўляецца адной з найбольш прыметных асаблівасцей сучаснай адукацыі. У працэсе культуралагічнай адукацыі моладзь рыхтуецца да асабістай арыентацыі ў сучасным свеце, да асэнсавання яе як сукупнасці культурных дасягненняў чалавечага грамадства. Культуралагічная адукацыя садзейнічае ўзаемаразуменню і прадукцыйным зносінам прадстаўнікоў розных культур.

Разам з тым цікавасць да культуралагічнай праблематыкі патрабуе абнаўлення метадалогіі даследаванняў, выкарыстанныя розных падыходаў да вывучэння культур.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасныя беларускія культуролагі даследуюць заканамернасці развіцця і функцыянавання культуры, яе структуру і дынаміку, узаемасувязі і ўзаемадзеянне з іншымі сферамі матэрыяльнага і духоўнага жыцця. У ліку важнейшых праблем культуралогіі і даследаванне пытанняў гісторыі і тэорыі сусветнай і айчыннай культуры.

Такім чынам, культуралогія на мяжы XX—XXI стст. стала абагульняючай навукай аб культуры, якая надае лагічную стройнасць і завершанасць культуразнаўству.

Культуралогія як комплексная гуманітарная навука фарміруецца на стыку гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, антрапалогіі, этналогіі, мастацтвазнаўства, семіётыкі, лінгвістыкі, інфарматыкі, сінтэзуючы і сістэматызуючы пад адзіным пунктам гледжання даныя гэтых навук. Струкутура культуралогіі, яе метады, адносіны да тых ці іншых галін навуковых ведаў застаюцца прадметам дыскусій беларускіх вучоных. Тым не менш сёння культуралогія ўключана ў агульную сістэму ведаў і займае ў ёй строга вызначанае месца, мае ўласны прадмет даследавання з канкрэтнымі метадамі. Да пачатку XXI ст. сфарміраваліся пэўныя галіны культуралагічных ведаў: гісторыя культуры, гісторыя культуралагічных тэорый, філасофія культуры, тэорыя культуры, сацыялогія культуры, эканоміка культуры, культурная антрапалогія, культураметрыя і інш.

У Беларусі да канца 90-х гадоў XX ст. афарміліся навуковыя цэнтры, дзе спрабуюць асэнсаваць палітычныя і культурныя рэаліі XXI ст., тэарэтычныя праблемы культуры. Найбольш істотны ўклад у развіццё сучасных культуралагічных тэорый уносяць вучоныя Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Беларускага інстытута праблем культуры, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Пры Беларускім універсітэце культуры з 1998 г. функцыянуюць аспірантура па спецыяльнасці 24.00.01 — тэорыя і гісторыя культуры і савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Вучоныя універсітэта займаюцца даследаваннем сацыядынамікі культуры, яе рухаючых грамадскіх фактараў, або сацыяльных механізмаў культуры. Ва універсітэце падрыхтаваны і выдадзены шэраг прац, прысвечаных вывучэнню ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сацыяльнага быцця ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры. Найбольш значныя з іх «Філасофія культуры», «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме», «Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме», «Дамінанта культуратворчай дзейнасці на мяжы стагоддзяў», «Этнапсіхалагічныя асновы культурагенезу», «Архітэктурная герменеўтыка», «Філасофія прыгажосці» і інш.

Маладымі вучонымі краіны Т.І.Якавук, С.Л.Вілейкам, А.А.Касперуком, І.Л.Коганам, Ю.Г.Болатавай, Э.А.Усоўскай, В.В.Калацэем завершаны даследаванні дынамікі і базавых кампанентаў каштоўнасных арыентацый ваеннаслужачых ва ўмовах трансфармацыі сацыякультурнага асяроддзя, станаўлення і развіцця кніжнай культуры як неад'емнай часткі нацыянальнай культуры, аксіялагічных і структурных асноў мастацкай культуры, пытанняў генезісу, тыпалогіі і механізмаў захавання традыцыйнай культуры, ролі і месца ў структуры культурнага арганізма этыкі і рэлігіі, іх узаемаадносін як сэнсаўтваральнага прынцыпу складу і стылю культуры.

Цікавыя даследаванні культуры канкрэтных сацыяльных арганізмаў, існуючых у пэўных прасторава-часавых рамках, а таксама культуры рэгіёнаў праводзяцца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце пад кіраўніцтвам доктара філасофскіх навук, прафесара У.Д.Разенфельда. У гэтай ВНУ некалькі гадоў функцыянуе савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па гістарычнай культуралогіі.

Інтэнсіўна вядзецца работа па даследаванні этнасацыяльных і сацыякультурных працэсаў (у першую чаргу пагранічнага рэгіёна), што дазволіла ў выніку стварыць сумесна з Дзяржкамітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Цэнтр этнасацыяльных і сацыякультурных даследаванняў (кіраўнік — прафесар У.Д.Разенфельд), які плённа супрацоўнічае з навуковымі цэнтрамі блізкага і далёкага замежжа (Маскоўскі дзяржаўны універсітэт, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны універсітэт, Уральскі дзяржаўны універсітэт, Універсітэт у Беластоку, Іерусалімскі універсітэт і інш). Цэнтрам праведзены шэраг міжнародных навуковых канферэнцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новым кірункам у культуралогіі з’яўляецца архітэктурная герменеўтыка. Асэнсаваннем прыроды і сутнасці архітэктанічнай творчасці, культуралагічнай інтэрпрэтацыяй архітэктуры займаецца доктар культуралогіі І.В.Марозаў. У яго навуковых працах разглядаюцца сінкрэтычнасць артэфактаў, складаючых тую ці іншую лакальную ў прасторы і часе культуру, граматычныя і стылістычныя заканамернасці мастацкай мовы дойлідства.

Усебакова вывучаны сутнасныя праявы прыгажосці, дэтэрмінуючай развіццё культуры, доктарам культуралогіі У.Ф.Мартынавым. Ім раскрыта ўзаемадзеянне іманентнага і трансцэндэнтнага, прыроднага і сацыякультурнага, абмежаванага і бязмежнага, адноснага і абсалютнага ў фарміраванні пачуцця прыгажосці.

Вучоныя Беларускага інстытута праблем культуры, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ і некаторых НДІ займаюцца даследаваннямі, вынікі якіх накіраваны на рашэнне практычных праблем развіцця культуры. У прыватнасці, імі распрацоўваюцца канцэпцыя культуралагічнай адукацыі моладзі, фундаментальныя даследаванні асноў нацыянальна-культурнай прававой дзяржавы. Беларускі інстытут праблем культуры каардынуе дзейнасць дванаццаці часовых навуковых калектываў, якія распрацоўваюць канцэптуальныя асновы і праграму развіцця народнай творчасці і прафесійнага мастацтва, інфармацыйную інфраструктуру галіны культуры, сістэму нормаў і прынцыпаў узаемадзеяння беларускай культуры з іншымі культурамі.

Безумоўна, сучаснымі культуралагічнымі даследаваннямі займаюцца Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Інстытут мовазнаўства, Інстытут эканомікі, Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф.Скарыны і інш.

Такім чынам, да XXI ст. у Беларусі сфарміравалася свая культуралагічная школа, якая займаецца даследаваннем заканамернасцей развіцця і функцыянавання культуры як цэласнасці, спецыфічнай функцыі і мадальнасці чалавечага быцця. Беларускія культуролагі займаюцца вывучэннем канкрэтна-гістарычных з’яў нацыянальнай і сусветнай культуры, генезісу і гісторыі культуралагічнай думкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ